# Музейны занятак
# “Загадкі ў беларускай хатке”

## Тлумачальная запіска

Музей-гэта своеасаблівая мадэль сістэмы культуры, якая адыгрывае вялікую ролю ў выхаванні асобы. Таму у 2010г было прята рашэнне аб стварэнні музея“Беларуская хата” у Граўжышкоўскай базавай школе для азнаямлення выхаванцаў дзіцячага садка і навучэнцаў школы з культурай і бытам беларускага народа. Экспанаты музея збіраліся разам з навучэнцамі, бацькамі і педагогамі. Большасць экспанатаў былі прывезены з вёсак Граўжышкоўскага сельскага Савета.

Актуальнасць заняткаў у музеі заключаецца ў тым, што для развіцця, навучання і выхавання маладога чалавека выключна важныя сувязь з мінулымі пакаленнямі, фарміраванне культурнай і гістарычнай памяці. Каб дзіця магло прасякнуццатакімі пачуццямі, недастаткова толькі прачытаць, паглядзець ці пачуць патрэбную інфармацыю, тут патрабуецца дакрануцца да эпохі, пакранаць яе рукамі і эмацыйна перажыць артэфакты. Прапанаваны музейны занятак праводзіць педагагічна мэтазгодная, бо вырашаецца не толькі адукацыйная задача - засвайваюцца дзіцем звесткі, краязнаўчыя веды, а ідзе працэс выхавання, фармаванне асобы, такіх маральных якасцяў, як патрыятызм, грамадзянскасць, адказнасць за лёс сяла, выхаванне агульнай культуры, у тым ліку музейнай. Рэальная гуманізацыя выхавання сёння магчыма, перш за ўсё, на нацыянальным, рэгіянальным матэрыяле - канкрэтнай сям'і, малой радзімы. Унікнуўшы ў гісторыю рэспублікі, раёна, атрымаўшы пра іх дадатковыя звесткі, дзіця спазнае і агульначалавечыя каштоўнасці.

У асновумузейнага занятка закладзены гульнявы прынцып апускання ў гістарычнае, адаптаванае для дзіцячага ўспрымання асяроддзе, якое дазваляе дзецям выкарыстоўваць наяўныя ў іх уяўленні і жыццёвы вопыт, актывізаваць пошукава-даследчыя ўменні. Гэта не першы музейны занятак малодшых навучэнцаў. Першапачаткова дзеці знаёміліся з прадметамі побыту, іх назвамі, прызначэннем, спосабамі дзеянняў з імі; затым - з гісторыяй прадмета, яго ўзнікненнем, акцэнтавалася ўвага на залежнасць прадметаў ад ладу жыцця людзей.

Занятак праводзяць навучэнцы-экскурсаводы музея. Гэта дае магчымасць уцягваць школьнікаў у грамадска-карысную навукова-даследчую і праектную дзейнасць па вывучэнні, ахове і папулярызацыі гісторыка-культурнай спадчыны роднага краю сродкамі краязнаўства і музейнай справы, фарміраваць сацыяльна актыўную, адказную, творчую асобы, якая арыентуецца на далейшыя самастойныя кантакты з культурай. Прадстаўлены занятак праводзіцца ў форме тэатрэлізаванага прадстаўлення з выкарыстаннем элементаў ролевай гульні. Навучэнцы -экскурсаводы сустракаюць школьнікаў пачатковых класаў у нацыянальных касцюмах, што адразу выклікае зацікаўленасць экскурсантаў.

**Мэта:**стварэнне ўмоў  для засваення дзецьмі багацця нацыянальнай культуры,  укладу жыцця народа; фарміраванне рэтраспектыўнага погляду на прадметы музейных экспазіцый (арынтаванне ў мінулым і сучаснасці).

Задачы:

- садзейнічаць выхаванню нацыянальнай самасвядомасці,  цікавасці да гістарычнай спадчыны праз замацаванне ведаў аб сялянскай хаце і побытам традыцыйнай беларускай сям'і, аб беларускіх нацыянальных гульнях;
- развіваць пазнавальныя здольнасці і пазнавальную дзейнасць;
- развіваць дыялагічную мову, замацоўваць уменне слухаць адказы таварышаў;
- развіваць правілы этыкету, культуры паводзін  ў музеі.

**Абсталяванне:** нацыянальныя касцюмы- мужчынскі і жаночы**,** карткі з выявамі экспанатаў музея.

Ход.

Экскурсаводы сустракаюць экскурсантаў на парозе сялянскай хаты:

1 Добры дзень, дзеці! Сёння разам з вамі мы здзейснім невялікае падарожжа. Хто з вас любіць падарожнічаць? *(Адказы дзяцей)* А падарожжа ў нас будзе незвычайнае. Мы паспрабуем вярнуцца ў мінулае і запрашаем вас  у гасці да нас – гаспадароў хаты Алесі і Алеся. Згодны? *(Адказы дзяцей)* Тады заплюшчым вочкі.Палічым: раз, два, тры! І зробім тры крокі наперад. *(Дзеці праходзяць ў "сялянскую хату")*

2.Вось мы і апынуліся ў хаце. Беларусы сваю хату нярэдка называліхаткай, хацінкай — і не таму, што яна была малой па памерах, а таму, што так, памяншальна-ласкальна, хацелі выказаць свае сардэчныя адносіны да асяродку.

1.Гасцей у нашу хату запрашаем
І сардэчна ўсіх вітаем.
З нашых вёсак прывезены рэчы
І гатовы да сустрэчы.

2. У хатах беларусаўспрадвекупрыемна пахла свежым хлебам, напаленайпечкай. Сялянскі дом ніякнельгаўявіць без печкі, у якойпатрэскваюць і страляюцьчырвонымівугельчыкамідровы. Пра хату народ складаў прыказкі, прымаўкі, загадкі. Тут шмат цікавых рэчаў пра якіх вы ўжо шмат шко ведаеце.
Вось таму наша экскурсія ў сялянскую хату пройдзе ў выглядзе гульні-адгадайкі "Загадкі ў беларускай хатке"

1.Правілы гуольні:

Мы чарзе мы загадваем загадкі, вы – уважліва слухаеце, шукаеце адгадку ў музеі, пры з’яўленні цяжкасцей – мы паказваемвыяву экспаната, далей знаходзіце яго на экспазіцыі. Хто першы адказвае – атрымае картку з выявай прылады. Пераможцам будзе той, у каго наібольшая колькасць картак. Пачынаем.

2. Пешая наша частка загадак прысвечана абсталяванню і убранству сялянскай хаты. Слухайце ўважліва

**Загадванне загадак.**



Рагаты, ды не бык, яду бярэ, а не сыты,
людям падае,а сам у кут ідзе.
(*вілкі)*



За вушы два канцыдугітрымаюцьмораберагі (*вядро*)



У аднагапарсюка два лычы
**(***начоўка***)**



Каля ямы ўсе з кіямі (*Міска*)



Не разыначка (ізюм) я, а мянеўсесмакуюць,
не дзяўчыначка я, а мянеўсецалуюць. (*лыжка*)



Быў на капальні, быў на таптальні,
быў на кружары,быў на пажары (*збан, ).гарлач)*
*Адаўтара:* кружар – ганчарны круг.



Надзеў на вяселлепрыгожы жупан,
На возе рассеўся і едзе як пан.(*куфар*)

Падліпавым кустом мяцеліцамяце.(*сіта*)





Цыган цыганку за грывупавалок.(чапяла)

Яна галодная – хата халодная.
Яна пад’ела – у хацепацяплела (*печ*)



Трапечацца ў руках,як белакрылы птах,
Маркоціцца тады,калі няма вады.(*ручнік*)





Чатырынагі маю, але не звер,
Пух і пер’е маю, але не птах,
Цела маю, ды не чалавек.(*ложак*)

Ножакён не мае,
Ён з аднаюручкай,
А грыбызбірае
Збабкай і ўнучкай (*кош*)



Пад адной страхой чатыры браты стаяць
*(Стол)*



Білімяне, білі, калацілі,
на кавалкірвалі, па паліцягалі,
на ключ замыкалі і
на стол паслалі (*абрус*)

Уздоўж сцен ў хаце стаялі лавы: дубовыя, добра ўмацаваныя, шырокія. Хто хоча прысесці на лаву? *(Усе садзяцца на лаву)*
Цяпер давайце ўзгадаем, якія народныя гульні мы ведае *(дзеці называюць.)*
Явам прапаную новую гульню, у якую гулялі ў дзяцінстве вашы бабулі і дзядулі.Завецца яна «Кольца-кольца, выйдзі на ганак!» (*дадатак* 1)

**Гульня “Кольца-кольца”**

Каб захаваць дабрабыт сваёй сям’і нашым продкам даводзілася вельмі шмат працаваць.
Таму наступная частка загадак прысвечана сялянскай працы. Слухайце ўважліва.

Шчыруюць на дрывотні сёстры
Над сухастою возам:
Аднасястра з зубамівострымі,
Другая – з вострым носам (*піла і сякера*).



Накамені камень ляжыць,
Што за белы ручай
З-падтыххкамянёўбяжыць?*(жорны)*



Нібыта фокуснік стужкі,
ён выкідае з рота стружкі.(*гэблик,рубанак)*



Маленькі, гарбатенькі
Усё поле абскакаў,
Год проляжаў і зноў паскакаў



Калі нехта груз кладзе,
Вагу адразу выдае.
З дакладнасцю да грама
Прылада патрэбная самая*(вагі)*





Чым я большвярчуся,
тым я больштаўсцею (*верацяно*)

Жук стальны навылет, зверхуўніз
Дуб прагрыз і на волю вылез*(свярдолак)*



Вось і закончылася наша падарожжа. Яшчэдалёка не ўсесакрэты раскрыла передвамі наша беларуская хата. Але час развітвацца.Да новых сустрэч, паважаныягосці.Ці спадабалася вам ў гасцях ў Алесі і Алеся ? А зараз трэба вяртацца назад. Давайце зноў закрыем з вамі вочкі і зробім тры крокі назад. Вось мы і вярнуліся з падарожжа па сялянскай хаце.Скажыце, а што больш за ўсё вам спадабалася, а, можа, і здзівіла? (*Адказы*)

Трэба ведаць – сэрца просіць
Якдзядам, бацькам жылося…
Якзямлю плугомаралі,

Якнапанапрацавалі…
Трэбаведаць і пратое,
Апраналішто? Якое?..
Як у святы гасцявалі,
На вячорках як спявалі.
Гэта спадчына святая
Непрыдуманая, тая,
Што спакон вякоў вялася,
Што ў сэрцы засталася.

А зараз я з вамі развітваюся. Добрага вам настрою і да новых сустрэч!

Крыніцы:


1. Народная культура Беларусі :энцыклапедычныдаведнік / рэд. В.С. Цітоў. – Минск : БелЭн, 2002. – 432 с. - ISBN 985-11-0249-0 : 8115 р., 8540 р.

2. ЭтнагафіяБеларусі. Энцыклапедыя. Рэд. П. Шамякін [и др.]. Мінск: БеларускаяСавецкаяЭнцыклапедыя, 1989. — 575 с.

3. Сугакова Г. Ч.Метадычная распрацоўка тэматычнай экскурсіі. – Наваполацк. 1916 https://infourok.ru/kursy/search

4. Цітоў В.С. Этнагарафічная спадчына. Беларусь. Традыцыйна-бытавая культура. Мн. 1997

5. https://dcrr-naroch.schools.by/pages/znaemstva-z-belaruskaj-movaj

6. https://gock.schools.by/pages/zagadk-ab-pradmetah-tradytsyjnaga-pobytu-belarusa-z-fota

## Дадаткі

*Дадатак* **1**

## Гульня “Кольца-кольца”

Усе ўдзельнікі ўсаджваюцца на лаўцы, сярод іх выбіраецца вядучы. Цяпер гэта буду я. Вядучы хавае ў далонях кольца, а вы складаеце далоні лодачкай. Вядучы падыходзіць да кожнага са словамі: "Я нашу-нашу кольца і камусьці падару!".Рэч вядучы ўкладае ў рукі аднаму з тых, хто сядзіць на лаўцы, але робіць гэта максімальна незаўважна, каб іншыя не змаглі вызначыць, у каго ж запаветны прадмет. А той, хто атрымаў падаруначак таксама застаецца «стрыманым»: не выдае сябе.Пасля таго як вядучы наведаў кожнага, ён адыходзіць трохі ў бок і кажа ключавыя словы: "Кольца-колца, выйдзі на ганак!". Удзельнік з упрыгожваннем павінен хутка падбегчы да дарыльшчыка. А вы пры гэтым паспрабуйце зразумець, каму дастаўся "прыз", і не даць гэтаму ўдзельніку пакінуць лаўку. Калі яму выслізнуць атрымалася, то ён становіцца новым вядучым. А калі не - кіруе ранейшы удзельнік. Зразумелыя







ўмовы?

*Дадатак2*

*Вядучыя – экскурсаводы*

*Дадатак3*





*Занятак “Загадкі ў беларускай хатке”*